# АЛЯКСАНДР ІОСІФАВІЧ ПАДЛУЖНЫ
## (Да 80-годдзя з дня нараджэння)



Аляксандр Іосіфавіч Падлужны адносіцца да тых яркіх асоб, якія пакідаюць пасля сябе выразны след добрых і каштоўных спраў, што на многія дзесяцігоддзі маюць агульнакультурнае значэнне, служаць развіццю роднай беларускай мовы, яе ўзорнаму гучанню, трываласці моўных норм. Спалучэнне таленту арганізатара навукі і вучонага-даследчыка – з'ява не такая ўжо і распаўсюджаная. Творчая біяграфія акадэміка А. І. Падлужнага – адзін з прыкладаў такога шчаслівага спалучэння. Пачаўшы навуковы шлях з пасады малодшага навуковага супрацоўніка, вучоны вырас да акадэміка-сакратара Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў, якое ўзначальваў пяць гадоў (1997–2002). Дваццаць гадоў кіраваў Інстытутам мовазнаўства – спачатку быў намеснікам дырэктара па навуковай рабоце (1983–1989), а потым дырэктарам (1989–2003). Шмат гадоў узначальваў беларускую нацыянальную камісію Агульнаславянскага лінгвістычнага атласа пры Міжнародным камітэце славістаў. На любой пасадзе ўсе сілы, веды і здольнасці ўмеў скіраваць на прагрэсіўны рух навукі. Сярод кіраўнікоў заўсёды вылучаўся высокай прынцыповасцю, дысцыплінаванасцю і адказнасцю, чаго патрабаваў і ад падначаленых. Удумлівае вызначэнне А. І. Падлужным прыярытэтаў лінгвістычнай навукі пацверджана выданнем буйных, грунтоўных прац пад грыфам Інстытута мовазнаўства НАН Беларусі. Менавіта такім грунтоўным, фундаментальным выданням аддаваў многа ўвагі пры падрыхтоўцы – этымалагічнага і гістарычнага слоўнікаў, нарматыўнага і дыялектных слоўнікаў, граматык і атласаў.

Нарадзіўся А. І. Падлужны 16 жніўня 1935 г. у вёсцы Залессе Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і калгаснікаў. Пасля заканчэння Мсціслаўскага педагагічнага вучылішча ў 1954 годзе ён паступіў на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, які паспяхова закончыў у 1959 годзе. Працаваў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў Раснянскай сярэдняй школе на Магілёўшчыне. Дапытлівы юнак вырашыў сур'ёзна заняцца навукай, і ў 1962 годзе паступіў у аспірантуру пры Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа. З гэтага часу ўсё жыццё Аляксандра Іосіфавіча было непарыўна звязана з вядучай мовазнаўчай установай Беларусі, роднай беларускай мовай.

З першых дзён працы ў акадэмічным Інстытуце яшчэ малады даследчык звярнуўся да найбольш актуальных і маласпрацаваных у тэарэтычным і практычным плане праблем беларускага мовазнаўства. Пасля паспяховай абароны ў 1967 годзе кандыдацкай дысертацыі «Фаналагічная сістэма беларускай літаратурнай мовы» ў беларусістыцы пачаўся якасна новы этап вывучэння гукавога ладу мовы. Асабістая заслуга вучонага – разгортванне і развіццё эксперыментальнага даследавання гукавога ладу беларускай мовы ў краіне. У 1969 годзе А. І. Падлужны стварае лабараторыю эксперыментальнай фанетыкі і праводзіць агромністую працу па даследаванні артыкуляцыі беларускіх гукаў, іх акустычнай будовы і ўспрымання, што дазволіла сістэмна апісаць асноўныя характарыстыкі артыкуляцыйнай базы беларускай мовы, стварыць навукова абгрунтаваную артыкуляцыйна-фізіялагічную класіфікацыю гукаў беларускай мовы, параўнаць іх з тыпалагічна падобнымі гукамі суседніх славянскіх моў. У гэтым жа годзе выйшла першая манаграфія таленавітага вучонага «Фаналагічная сістэма беларускай мовы». Напружаная, творчая праца лабараторыі эксперыментальнай фанетыкі дала свае плённыя вынікі. Значным крокам на шляху стварэння навуковай апісальнай фанетыкі сучаснай беларускай літаратурнай мовы стала апублікаваная ў 1973 годзе кніга А. І. Падлужнага «Гукі беларускай мовы» (суаўтар В. М. Чэкман). У гэтай навуковай рабоце разгледжаны асаблівасці ўтварэння галосных і зычных гукаў беларускай мовы. Неабходна падкрэсліць, што гэта даследаванне гукавой сістэмы беларускай мовы ўпершыню было зроблена на эксперыментальным матэрыяле – рэнтгенаграм, палатаграм, лінгваграм, аданаграм дыктараў, якія валодаюць літаратурнымі нормамі вымаўлення.

У манаграфіі «Нарыс акустычнай фанетыкі беларускай мовы», што выдадзена ў 1977 годзе, пададзена характарыстыка гукаў беларускай мовы з пункта погляду акустыкі моўнага сігналу і яго ўспрымання, што дазволіла правесці фанемную класіфікацыю. Па гэтай праблеме ў 1981 годзе вучоны абараніў доктарскую дысертацыю «Фанетычная сістэма беларускай мовы (эксперыментальна-фанетычнае даследаванне гукавога складу)»,

дзе ўпершыню ў беларусістыцы прыведзены эксперыментальныя даныя пра акустычную будову маўлення, зроблена іерархічная класіфікацыя акустычных прымет маўленчага сігналу, устаноўлена сегментная структура беларускага маўлення і прапанавана акустычная класіфікацыя гукаў. Створаная даследчыкам арыгінальная тэорыя працэсаў успрымання мовы дазваляе і зараз вызначаць рэальныя шляхі выкарыстання фанетычных ведаў у дыягностыцы моўнай функцыі слыху чалавека, у аўтаматычным распазнаванні і сінтэзе мовы.

Пад кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле А. І. Падлужнага праведзена распрацоўка пытанняў беларускай фанетыкі і фаналогіі сучаснай літаратурнай мовы, якая была абагульнена ў манаграфіях «Фанетыка слова ў беларускай мове» (1983), «Фанетыка беларускай літаратурнай мовы» (1989), а таксама ў шэрагу артыкулаў «Дыстрыбуцыйныя класы фанем у беларускай мове», «Нормы беларускага літаратурнага вымаўлення», «Біялагічныя і сацыяльныя аспекты гукавога ладу мовы» і інш.

У манаграфіі «Фанетыка беларускай літаратурнай мовы», выдадзенай у 1989 годзе, вучоны змяшчае апісанне гукавога ладу сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Прыводзяцца артыкуляцыйныя і акустычныя характарыстыкі беларускіх гукаў, іх фаналагічная інтэрпрэтацыя, даюцца вынікі ўспрымання розных гукавых адзінак носьбітамі беларускай мовы. У гэтым даследаванні ўпершыню ў беларускай фанетыцы абагульняюцца звесткі аб спалучэннях гукаў у спрадвечна беларускай і запазычанай лексіцы.

Асноўныя напрамкі навуковай дзейнасці А. І. Падлужнага – гэта фанетыка і фаналогія роднай мовы. Разам з тым таленавітага вучонага цікавілі і хвалявалі праблемы нармалізацыі беларускага літаратурнага маўлення, граматыкі і арфаграфіі сучаснай мовы, пытанні лексікалогіі і лексікаграфіі, сацыялінгвістыкі. Так, праведзеныя даследаванні фаналагічнай сістэмы беларускай літаратурнай мовы з'явіліся асновай распрацоўкі пытанняў правапісу і арфаэпіі, што знайшлі адлюстраванне ў раздзелах «Фанетыка» і «Арфаэпія» ў выдадзенай у 1985 годзе нарматыўнай акадэмічнай граматыцы «Беларуская граматыка», а таксама ў нарматыўным «Слоўніку беларускай мовы: Арфаэпія. Арфаграфія. Акцэнтуацыя. Словазмяненне», які пабачыў свет у 1987 годзе. А. І. Падлужны з'яўляўся членам рэдкалегіі і адным з аўтараў першай лінгвістычнай энцыклапедыі «Беларуская мова», якая была апублікавана ў 1994 годзе.

Навуковыя інтарэсы Аляксандра Іосіфавіча няўхільна пашыраліся. Усё больш істотнае месца на рубяжы стагоддзяў у навуковай дзейнасці вучонага пачалі займаць праблемы нармалізацыі сучаснай беларускай мовы, моўнай палітыкі і ролі мовы ў суверэннай Беларусі, пытанні ўдасканалення правапісу. Так, у кнізе «Мова і грамадства» (1997) даследчык акцэнтаваў увагу на стане, працэсе развіцця, статусе беларускай мовы ў грамадстве, на пэўных складанасцях, што існавалі у моўнай сферы ў канцы XX ст. Пад кіраўніцтвам акадэміка А. І. Падлужнага была распачата падрыхтоўка новай рэдакцыі «Правілаў беларускай арфаграфіі і пунктуацыі», у якой многія правілы пазбаўлены ад выключэнняў, атрымалі сучасную трактоўку, значна спрошчаны і прыведзены ў адпаведнасць з моўнай практыкай.

Творчая спадчына вучонага з'яўляецца яскравай старонкай у гісторыі беларускага мовазнаўства. Асноўныя працы А. І. Падлужнага маюць прыкладны характар, адрасаваны тым, хто вывучае беларускую мову. Ён – адзін з аўтараў кнігі «Белорусский язык для небелорусов» (1973, 1978). Трэці раз дапоўненая і перапрацаваная кніга выйшла пад назвай «Белорусский язык для говорящих по-русски» (1990). Вучоны з'яўляецца суаўтарам шэрага вучэбных дапаможнікаў для ВНУ, сярод якіх «Фанетыка беларускай мовы» (1984), «Практыкум па фанетыцы беларускай мовы» (1989), «Учебник белорусского языка для самообразования» (1994) і інш. А. І. Падлужны – навуковы рэдактар і адзін з аўтараў кнігі «Беларуская мова: Цяжкія выпадкі фанетыкі, арфаграфіі, граматыкі» (1987), зборніка «Культура беларускай мовы» (1991), хрэстаматыі «Вусная беларуская мова» (1990).

Вядомы вучоны шчодра дзяліўся са сваімі вучнямі набытымі ведамі і багатым вопытам: чатырнаццаць аспірантаў пад яго кіраўніцтвам атрымалі дыплом кандыдата філалагічных навук і адзін – доктара навук. Клопатамі аб росце ў краіне высокакваліфікаваных кадраў была прасякнута дзейнасць акадэміка А. І. Падлужнага на пасадзе старшыні савета па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый пры Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі, які ён узначальваў з 1989 па 2003 год.

Акадэмік А. І. Падлужны – буйны спецыяліст у галіне сучаснай беларускай мовы. Яго навуковыя даследаванні па беларускай фанетыцы і фаналогіі добра вядомы не толькі вучоным Беларусі, але і лінгвістам замежжа. Нязменна выклікалі цікавасць славістаў яго даклады па фанетыцы і фаналогіі на пасяджэннях Міжнароднай камісіі Агульнаславянскага лінгвістычнага атласа пры Міжнародным камітэце славістаў. Плённая дзейнасць даследчыка атрымала высокую ацэнку, прысвоена вучонае званне прафесара (1989), у гэтым жа годзе вучоны быў абраны членам-карэспандэнтам, акадэмікам Акадэміі навук Беларусі (1994). Як адзін з актыўных арганізатараў мовазнаўчай навукі ў Беларусі А. І. Падлужны ўзнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР (1983), ордэнам «Знак Пашаны» (1986), стаў заслужаным дзеячам навукі Рэспублікі Беларусь (1999).

Прайшлі гады, але творчая спадчына Аляксандра Іосіфавіча Падлужнага, нястомнага, руплівага, сумленнага вучонага, кіраўніка і настаўніка спрыяе развіццю і ўзбагачэнню мовазнаўчай навукі ў Беларусі. За сваё творчае жыццё вучоны нямала павандраваў па свеце, пабываў у свой час у многіх замежных краінах, але мілей за ўсё яму была родная Беларусь, яе прырода, людзі і, вядома, родная беларуская мова, якую ён узносіў і ў імя якой твáрыў.

*В. П. Русак*